# Большая перемена

Спецвыпуск «Дзень роднай мовы»

Издается с декабря 2005 года

*Газета Государственного учреждения образования «Средняя школа №2 г. Калинковичи»*





## 21 лютага

*Міжнародны дзень роднай мовы*

**Я ♥ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ!**

“Той, хто не паважае **родную мову**, не паважае **родны народ**”

**Іван Мележ**

### В ЭТОМ ВЫПУСКЕ


20 слоў, якія павінен ведаць кожны беларус ..........................2

Сарагаворкі на ўсялякі выпадак ............................ 2

10 нечаканых фактаў. Іван Мележ ...................... 3

Народныя прыкметы ........................ 4

Усміхніся ......................... 4


ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ ПРА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

## З ГІСТОРЫІ ПРА НЯПРОСТЫ ЛЁС РОДНАГА СЛОВА БЕЛАРУСАЎ

1. Беларуская мова адносіцца да славянскай групы індаеўрапейскай моўнай сям’і.

Літаратурная беларуская мова па розных ацэнках налічвае ад 250 да 500 тысяч слоў. Дыялектная мова Беларусі нашмат багацейшая — налічвае 1,5-2 мільёны слоў.

2. Навукоўцы вызначаюць фарміраванне беларускай (старабеларускай) мовы як самастойнай пачынаючы ад XIII стагоддзя.

Сучасная беларуская мова пачала фармавацца ў XIX ст.

Францішак Скарына выдаў “Біблію” старабеларускай мовай у 1517 годзе ў Празе.

3. Беларускі кірылічны алфавіт налічвае 32 літары. Апроч гэтага, існуе сістэма пісання лацінкаю і арабскай вяззю (кітабамі).

4. У беларускай мове выкарыстоўваюцца два правапісы. Закладзены ў 1918-м мовазнаўцам і грамадска-палітычным дзеячам Браніславам Тарашкевічам правапіс на сёння называецца класічным, або “тарашкевіцай”.

У 1933-м, а таксама ў канцы 1950-х правапіс змянілі ў рамках русіфікацыйных рэформаў. Рэфармаваны правапіс мае нефармальную назву “наркамаўка”. Пасля ўступлення ў сілу правапіснага закона 2008-га ён канчаткова замацаваў за сабой статус афіцыйнага правапіса.

5. У выніку шматгадовага суіснавання беларускай і расійскай мовы з’явілася так званая трасянка. Лічыцца, што гэтая моўная з’ява стала наступствам камунікацыі паважна беларускамоўнага вясковага насельніцтва з расійскамоўным горадам.

Па меркаванні некаторых даследчыкаў, сталінскія рэпрэсіі паспрыялі пашырэнню трасянкі, бо само ўжыванне роднай мовы магло стаць прычынай для абвінавачвання ў нацдэмаўшчыне.

6. Скульптурным увасабленнем адметнасці беларускай мовы з’яўляецца помнік літары “Ў” у Полацку (2003 год). Ля падножжа скульптуры выбітыя радкі з верша народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна: “Ад Еўфрасінні, ад Скарыны, ад Полацка пачаўся свет”. Аўтар праекту — мастак і дызайнер Ігар Куржалаў.




7. Закон аб мовах, прыняты ў студзені 1990-га Вярхоўным Саветам БССР, замацаваў за беларускай мовай статус адзінай дзяржаўнай. Расійская прызнавалася мовай міжнацыянальных зносін.

## З гісторыі пра няпросты лёс роднага слова беларусаў

8. У статусе адзінай дзяржаўнай беларуская мова праіснавала да майскага рэферэндума 1995-га. Расійская мова атрымала статус другой дзяржаўнай, гістарычная сімволіка была замененая на перапробленую савецкую.

9. Наступствы “раўнапраўя” моваў не прымусілі сябе доўга чакаць. У тым жа 1995-м больш за 100 школаў былі пераведзены на расійскую мову навучання. На сёння колькасць беларускамоўных школьнікаў імкліва змяншаецца, у абласных цэнтрах і буйных гарадах на роднай мове вучацца лічаныя адзінкі школьнікаў. У краіне няма ніводнай вышэйшай навучальнай установы, дзе б вялося навучанне па-беларуску.

10. Згодна дадзеных агульнанацыянальных перапісаў колькасць тых, хто дома размаўляе па-беларуску, няўмольна змяншаецца. Калі ў 1999-м 73,7 % жыхароў Беларусі назвалі беларускую мову роднай, то ў 2009-м ужо 53,2 %. У 1999-м дома па-беларуску размаўлялі 36,7 % апытаных, 2009-м — 23,4 %.

11. Многія з вас бачылі сацыяльную рэкламу «Смак беларускай мовы» і «Родныя даты». Гэта ўсё праекты кампаніі «Белзнешрэклама», якая тлумачыць сваю ініцыятыву так: «Беларуская мова мае непараўнальнае зачараванне, сакавітае гучанне, спецыфічны каларыт, гэта сапраўды ўнікальная мова, самая мілагучная пасля італьянскай і самая старажытная сярод славянскіх моў».

Натхнёная поспехам першых акцый, кампанія зладзіла сумесна з прадстаўніцтвам Samsung у Беларусі новы праект «Багацце-Смак-Прыгажосць беларускай мовы».




12. Шэраг беларускіх спартсмена ў ламаюць стэрэатып пра тое, што мова цікавая толькі людзям культуры.

Футбаліст Віталь Радзівонаў, напрыклад, лічыць, што размаўляць па-беларуску становіцца модна. Многа прыхільнікаў роднай мовы сярод беларускіх тайбаксёраў. Віталь Гуркоў, Дзмітры Валент, Юры Булат — гэтыя хлопцы не толькі размаўляюць па-беларуску, але і заклікаюць рабіць тое ж сваіх суайчыннікаў.

Вядомая пазітыўнымі выказваннямі пра мову і лёгкаатлетка Аліна Талай. Не адстаюць ад спартсменаў і многія футбольныя заўзятары, што ўпрыгожваюць трыбуны беларускамоўнымі банэрамі.

13. Прыкладам павагі да беларускай мовы для многіх беларусаў служаць паслы замежных краін, якія актыўна выкарыстоўваць яе у публічнай сферы. Адным з першых па-беларуску загаварыў пасол ЗША Джордж Крол. Яго ініцыятыву падхапілі шведскі пасол Стэфан Эрыксан, літоўскі — Эдмінас Багдонас ды іншыя.

14. Наша мова шырока прадстаўленая ў Сеціве і ў мабільных дадатках. Венгерскі матэматык і лінгвіст Андраш Корнай апублікаваў у 2013-м навуковую працу «Лічбавая смерць моў». Ён вывучаў сусветныя мовы, якія знаходзяцца пад пагрозай вымірання ў інтэрнэце і ў электронных прыладах. Беларуская мова апынулася ў ліку бясспрэчна жывых.

# 20 слоў, *якія павінен ведаць кожны беларус*

Найперш, трэба ведаць словы, якія людзі ўжываюць у паўсядзенным жыцці:

**Добры дзень**
**Да пабачэння**
**Дзякуй**
**Калі ласка**

Потым трэба ведаць звароты да людзей:

**Спадар**
**Спадарыня**

Словы, якія вызначаюць каардынаты нашага быцця:

**Продкі**
**Сучаснікі**
**Нашчадкі**

Словы, якія вызначаюць прыналежнасць да нашай зямлі:

**Краіна**
**Айчына**
**Бацькаўшчына**

Словы, якія вызначаюць асноўныя рысы людзей, якія жывуць на беларуская зямлі. Менавіта такімі хацелася б бачыць беларусаў:

**Годнасць**
**Гонар**
**Сціпласць**
**Перакананасць**
**Непахіснасць**

Словы, якія вызначаюць адметнасць погляду беларусаў на жыццё. Словы, якія паказваюць адметнасць нашай мовы і культуры:

**Шыпшына**
**Суніцы**

Назвы месяцаў:

**Люты**
**Сакавік**

Размаўляй са мной па-беларуску

## 20 СКАРАГАВОРАК *НА ЎСЯЛЯКІ ВЫПАДАК*

1. *Боб ды боб — два бабы, а яшчэ боб — тры бабы.*
2. ***Вадавоз вёз ваду ад вадаправода.***
3. *На двары стары баран грукаў зранку ў барабан.*
4. ***Добра ўсюды добраму. Добраму ўсюды добра.***
5. *І Піліп да ліпы прыліп. Да ліпы прыліп і Піліп.*
6. *Патап пакаваў пакупнікам пакупкі ў пакункі.*
7. ***Пракоп і Барыска елі барбарыскі.***
8. ***Ткач ткаў хустку на таху і хукаў на руку.***
9. *Скача чапля па балоце, чачотачка ў чароце,А чубаты чачот топча, топча агарод.*
10. ***Раз прывёз Рыгор Цімоху мех арэхаў, мех гароху.***

# 10 нечаканых фактаў

# ІВАН МЕЛЕЖ



***У маладосці складаў вершы, але стаў вялікім паэтам менавіта ў прозе. Стваральнік дзівоснай «Палескай хронікі», роўнай па сваёй паэтычнай глыбіні «Новай зямлі». Назвы яго твораў зьдзіўляюць сваёй мэтафарычнай знакавасцю: «Людзі на балоце», «Подых навальніцы», «Завеі. Снежань». Як і яго любімы Максім Багдановіч, захоўваў унутраную адзіноту і пакутаваў на сухоты. 8 лютага яму споўнілася б 95 гадоў. Герой 10 нечаканых фактаў — Іван Мележ.***

**1. Да з'яўлення «Людзей на балоце» беларускія пісьменнікі ставіліся да яго паблажліва**

У дзённіках Барыса Сачанкі знаходзім: «Я не вельмі цаніў яго дагэтуль. Ранейшыя творы здаваліся надуманымі, далёкімі ад праўды. Таму „Людзей на балоце" пачаў чытаць без асаблівай ахвоты. 20-40 старонак не захапілі. Сказаў нават нейкую недарэчнасць, Я. Брыль падтрымаў: „Іван можа, глядзі, скарачай" (...) Вялюгін пасмяяўся: відаць, лепей было б, каб раман згарэў (у Мележа быў пажар у кватэры, і раман сапраўды ледзь не згарэў). Але прачытаў 100, 200, 300 старонак — Божа мой, якая проза! Пасля К. Чорнага нічога падобнага не было".

**2. Не ўмеў хаваць незадаволенасці, калі яго крытыкавалі, і па-дзіцячы радаваўся, калі хвалілі**

Барыс Сачанка, як тонкі псіхолаг, адзначаў: «...калі я рабіў заўвагі не зусім тактоўныя, Іван Паўлавіч змаўкаў, засяроджваўся, потым надзяваў на галаву шапку, падымаўся з-за стала: „Часу сёння не маю, хіба пайду ўжо...". Я адчуваў — заўвага мая не спадабалася (...), і зноў пачынаў гаварыць добрае пра раман. Іван Паўлавіч сцягваў з галавы шапку, зноў слухаў, слухаў. Забываў, што часу не мае. (...) Застыне неяк увесь, паглыбіцца ў сябе і слухае, слухае...»

**3. У адрозненне ад большасьці пісьменнікаў, любіў расказваць пра ненапісанае**

Іван Шамякін успамінаў, што Мележ: «...многа і ахвотна гаварыў пра ненапісанае, пра тое, што думае пісаць, расказваў і сюжэт і схему развіцця характараў, як бы раіўся, як бы правяраў на субяседніку тое, што нарадзілася ці нараджаецца, але яшчэ не перайшло на паперу».

**4. Удава Янкі Купалы ледзь не давяла яго да страты прытомнасці**

У занатоўках за 1948 г. знаходзім такое апісанне Уладзіславы Францаўны: «Гаворыць, гаворыць — здаецца бяз ладу — з аднаго на другое: з успамінаў пра Янку на свае чаравікі, у якіх падэшва аказалася кепская. Потым зноў — на трэцяе, далей можа вярнуцца да першага. З ёю мімаволі стамляешся. Колькі ў ёй энэргіі. Якая яна была ў маладосці? Гадзіны чатыры паказвала мне архіўныя дакументы. Спачатку было цікава паглядзець, потым — нуднавата, а ўрэшце я адчуў, што галава пачынае кружыцца — блізка да вобмараку. Любіць хлапцоў маладых — пагаманіць, паклікаць іх на абед. Першыя тосты — „за маладосць!" „За мужчын, бо іх мала!" Знаёміцца адразу. Адразу — друг. Усе тайны табе».

**5. Ён вельмі падабаўся жанчынам, што аднак не ператварыла яго ў донжуана**

Калі Іван Мележ ачуньваў у 1942 г. пасля ранення ў шпіталі, амаль усе работніцы — ад галоўнага доктара да медсясцёр — былі ў яго закаханыя.

**6. Называў пышныя вяселлі паказухай**

Лідзія Пятрова-Мележ пісала: «10 красавіка 1943 г., не сказаўшы нікому ні слова, мы пайшлі ў загс і распісаліся. Абое лічылі, што гэта наша, прыватная справа і ніякага шумлівага вяселля нам не трэба. І пазней, усё жыццё Іван Паўлавіч не любіў пышных вяселляў, лічыў, што яны робяцца не для маладых, а для бацькоў і знаёмых бацькоў, а таксама для паказухі».

**7. У выхаванні дзяцей не прызнаваў нават намёку на тыранію**

Дачка Людміла ўспамінала, што яе бацька НІКОЛІ не павышаў голасу, не праяўляў дыктатарскіх замашак, не надакучаў павучаннямі і забаронамі. З ім было заўсёды лёгка і весела: «Я не помню ни одного момента, чтобы мы поссорились, или он, ударив кулаком по столу, что-нибудь мне запретил. Если же я совершала проступок, то отец ничего не говорил, а просто мрачнел, всем своим видом показывая, как он опечален, и уже от одного этого сразу же становилось ужасно стыдно».

**8. Яго злавала нацыянальная інэртнасць беларускага кіно**

«Фільмы нашай студыі нізкай якасці, неглыбокія і нудныя, расказваюць пра выпадковыя з'явы»; «...за многія гады студыя не вырасціла, не вывела на шырокую творчую дарогу ніводнага беларускага акцера. І наогул часцей за ўсё ў беларускіх фільмах месца для беларускіх акцераў няма. Беларуская студыя стала па сутнасці студыяй пракату акцераў маскоўскіх, ленінградскіх, адэскіх (...) не знялі ніводнага фільма, які б гаварыў на мове народа, беларускай мове».

**9. Лічыў асноўнай бядой сваёй краіны татальную русіфікацыю**

У артыкуле, прысвечаным дзейнасці беларускіх выдавецтваў, Іван Мележ пісаў: «Мала выдаецца на роднай мове палітычнай літаратуры, яшчэ менш — медыцынскай, і ўжо зусім зачынены дзверы для беларускай мовы ў тэхнічную, эканамічную літаратуры, у навуковую, — амаль ва ўсе галіны навукі. (...) для нашага народа не прайшлі бясследна дзесяцігоддзі і стагоддзі ўпартай русіфікацыі...»

**10. Яго любімы занятак — слухаць «Песняроў» і гаварыць пра літаратуру**

Дачка Людміла ўспаміналa, што яе бацька быў абыякавы да заняткаў спортам, без вялікай ахвоты хадзіў на опэру і балет, але вельмі любіў творчасць «Песняроў», а таксама духоўна натхняўся, калі размаўляў пра літаратуру: «Часто папа говорил: „Всё. Пойду поговорю о литературе". Набирал по телефону того или иного писателя (в основном он дружил с теми, кто был младше его) и беседовал о Кузьме Черном, Лукаше Калюге, Максиме Горецком и других своих любимых авторах. В доме тогда царила полная тишина, такой разговор мог длиться часами.»

Тираж 30 экземпляров



ГУО «Средняя школа №2
г. Калинковичи»

Адрес школы: 247710,
г. Калинковичи
Гомельской области,
ул. Пионерская, 27 Б

Телефон: 4 – 24 – 84

Email:guo.sosh2@yandex.by

http://k-soch-2.schools.by

Учредители:
Администрация
ГУО «Средняя школа №2
г. Калинковичи»,
Совет Школы

Мы вместе!

21 лютага

# ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ

## Чаму я размаўляю на беларускай мове?

- Я люблю Беларусь і паважаю сваіх продкаў
- Родная мова - тое, што адрозніває нас ад іншых народаў
- Беларуская мова грунтуецца на лексічнай базе старабеларускай
- Старабеларуская мова ў XVI ст. - мова міждзяржаўнай перапіскі ва Усходняй Еўропе і афіцыйная мова ВКЛ да 1696 г.
- Беларускую мову лічаць адной з прыгажэйшых у Еўропе
- Старабеларускую мову выкарыстоўваў першадрукар Ф. Скарына
- Родная мова - гэта спадчына і карані народа. Абсячыце карані - дрэва загіне...

*Толькі самыя развітыя краіны ў XVI ст. мелі законы на ўласнай мове: «не обчым якім языком, але сваім власным праваспісаныя маем» (Леў Сапега, XVI ст.)*

# НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ



**• Не мяці хату ў дзень восьмага ліпеня! Ты можаш вымесці са смеццем і дамавіка, які ў гэты дзень сядзіць пад мятлой. Тады твая хата застанецца без свайго ахоўніка і дапаможцы. Людзі кажуць, што: « У дзень на Хвядору — пакінь хату ў спакоі, смецце хай сабе ляжыць — дамавік на ім сядзіць».**

*• Пры пераездзе на новае месца жыхарства — стары венік патрэбна забраць разам з сабой, так як з ім перадаецца вязенне старой хаты. На гэтай хатняй прыладзе дамавік можа „пераехаць“ да свайго новага жылля.*

**• Нельга, кажуць старыя людзі, месці ў хаце рознымі венікамі, бо тады сваё багацце па ўсіх кутах «размяцеш», інакш кажучы, збяднееш зусім.**




# Усміхніся=)



**Скажы мне, што ты чытаеш, і я скажу табе, хто ты.**

**- Цікава... Я вось чытаю Гамера, Платона, Сакрата...**

**- Трапло ты, Мікола.**

* * *

Сын бацьку:

- Тата, у мяне да цябе 2 пытання.

- Якія?

- Першае: ці можна мне атрымліваць трохі больш грошаў? Другое: чаму не?

* * *

**Дарагія сябры!**
**Дарагія жанчыны!**
**Дарагія дзеці!..**
**Не, ну ты паглядзі — усё пада-ражэла!!!**

* * *

- Малады чалавек, а вас не вучылі ў дзяцінстве саступаць месца ў транспарце пажылым людзям?

- Бабуля, але гэта ж мая машы-на!

Ответственный за выпуск Макаревич Т.П.